№ 7
люты
2023 г.
Выдаецца са студзеня 2023 г.

# БІБЛІЯТЭЧНЫ ГАСЦІНЕЦ

ІНФАРМАЦЫЙНЫ БЮЛЕТЭНЬ МАГІЛЁЎСКАЙ РАЁННАЙ СЕТКІ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК



## Важкасць слова

*Да 80-годдзя з дня нараджэння Міхася ТЫЧЫНЫ*




13 лютага 2023 года ў Брылёўскай сельскай бібліятэцы-клубе была аформлена кніжная выстава “Важкасць слова”, прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння беларускага пісьменніка, літаратурнага крытыка і літаратуразнаўца Міхася Тычыны. На выставе былі прадстаўлены кнігі М.Тычыны па творчасці Кузьмы Чорнага, Аляксандра Пушкіна і Якуба Коласа, артыкулы з часопісаў, кнігі К.Чорнага. Выставу ўпрыгожылі кнігі М.Тычыны з дарчымі надпісамі аўтара.

У сельскай бібліятэцы-клубе вёскі Брылі 18 лютага 2023 г. прайшла гадзіна літаратурнага партрэта "Жыве яго слова", прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага. Загадчыца бібліятэкай з дапамогай відэапрэзентацыі расказала пра жыццё, творчасць і трагічны лёс Максіма Іванавіча Гарэцкага, пра яго выключна адметнае месца ў беларускай




літаратуры. Быў таксама зроблены агляд падрыхтаванай кніжнай выставы. Прагучалі ўрыўкі з твораў нашага славутага земляка.
Чытач бібліятэкі Мікалай Яцкоў распавёў пра свае сустрэчы з Радзімам Гаўрылавічам Гарэцкім — акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, пляменнікам Максіма Гарэцкага, які шмат што расказваў пра свайго славутага дзядзьку.

*Юлія ЯЦКОВА.*




## 14 февраля - Международный день дарения книг

**Уважаемые читатели! Библиотеки Могилёвского района приглашают всех желающих принять участие в акции "Дарите книги с любовью!" с 4 по 14 февраля 2023 года**

Главная идея праздника – вдохновить людей дарить друг другу хорошие книги и показать, что бумажная книга остается актуальным подарком и не теряет своей ценности.
Если у вас есть книги, которые вы уже прочитали – мы с благодарностью примем их в дар!

Государственное учреждение культуры "Могилёвская районная сеть публичных библиотек"
http://mrspb.mogilev.by
Могилёвская районная сеть публичных библиотек
bibliotekimog.raiona





Читатели Маховской сельской библиотеки приняли активное участие в акции «Дарите книги с любовью!». Главная идея акции — напомнить о том, что книга была и остается прекрасным подарком. Высказывание «Книга — лучший подарок», актуальна и в наш век технологий. Благодарим Вас, дорогие читатели, за подаренные книги!

*Екатерина ДУБРОВСКАЯ.*







18 февраля 2023 года филиал сельская библиотека агрогородка Кадино совместно с ГУО "Кадинская средняя школа" провели для учащихся 4 классов викторину "По страницам любимых сказок".

*Офеля АВЕТЯН.*

У бібліятэцы аграгарадка Рэчкі 16 лютага 2023 г. прайшоў беларускі чацвер з кнігамі для дзяцей пра дабро і добрыя справы. На нашай кніжнай палічцы дабра было чатыры кнігі: С.Давідовіч "Дабром за дабро", Т.Дамаронак "Добрыя справы", М. Пазнякоў "Святло Дабрыні" , "Родныя казкі, што дабра раюць: зборнік беларускіх народных казак". Гэта вельмі добрыя кнігі з казкамі і гісторыямі пра тое, як чалавек і прырода могуць па-добраму ўзаемадзейнічаць і дапамагаць адзін аднаму. Самымі актыўнымі ўдзельнікамі і слухачамі былі Ліза Красоўская і Дзіма Шушуноў.




### Кніжная палічка дабра



"Без узаемнай дапамогі жыць на гэтым свеце вельмі цяжка".

*З кнігі С. Давідовіча "Дабром за дабро"*

### Да дабра праз кнігу



"І ўсе ж галоўную ролю сыграла адна добрая справа, якая нарадзіла шмат добрых спраў".

*З кнігі С. Давідовіча "Дабром за дабро"*

"Усім хочацца, каб іх любілі і добрым словам віталі".

"Мы ўсе жадаем, каб побач з намі былі добрыя сябры і памочнікі. Але для таго, каб гэта адбылося, нам самім трэба быць добразычлівымі і ўважлівымі. дапамагаць родным, сябрам, імкнуцца рабіць добрыя справы".

*З кнігі Т.Дамаронак "Добрыя справы "*



"Кожны суперажывае разам з роднымі, блізкімі, знаёмымі, падзяляе з імі радасць і гора - таму і мае права называцца сапраўдным чалавекам".

*З кнігі С. Давідовіча "Дабром за дабро"*

"...цудоўная краіна ёсць на свеце!". Хоць яна і казачная, але сябраваць у ёй могуць па-сапраўднаму, ды так, каб не кідаць сябра ў бядзе і дапамагаць яму ў цяжкую хвіліну".

*З кнігі Т.Дамаронак "Добрыя справы "*




Книжкина суббота в Речковской сельской библиотеке прошла 18 февраля 2023 года со сказкой Оскара Уайльда "Мальчик-звезда", которая учит человечности, бескорыстию, состраданию и доброте. Ребята порадовали знанием сказки и поняли, что жестокость, зло, гордыня и эгоизм могут разрушить любую красоту и сделать любого человека несчастным.




**Тамара ЦИРКУНОВА.**

### Оскар Уайльд (1854-1900) и "Мальчик-звезда"



Оскар Уайльд , ирландец по происхождению, адресовал свои сказки взрослым, но сказка "Мальчик-звезда" только на пользу и в радость - детям. Эта сказка о доброте и человечности, о изгнании из сердца злобы, эгоизма и жестокости.Сказка очень драматична, но поучительна.

Участники литературной викторины по сказке Оскара Уайльда "Мальчик звезда"



Лучшие знатоки сказки Оскара Уайльда "Мальчик звезда"




Самые лучшие книги- это те, которые мы прочитали.




Пра гісторыю роднай мовы раскажуць кнігі



Удзельнікі гульні-вікторыны "Знаўцы беларускай мовы"



Цімафей, Дзіма, Юлія, Ліза, Наталля



Суддзі - Ангеліна і Алена



Цікава, хто пераможа?



Суддзі прыходзяць на дапамогу ...




ЦІМАФЕЙ (першы злева) стаў пераможцам гульні-вікторыны і лепшым знаўцам беларускай мовы




У літаратурным батле (лепшае чытанне верша) перамагла Ліза, самы маленькі ўдзельнік нашай праграмы

Дзень быў насычаны і змястоўны.

Удзельнікі нашай праграмы стаміліся, але вельмі прыемна, што дзень роднай мовы мы правялі разам.

Вялікі дзякуй усім, хто завітаў 21 лютага ў бібліятэку.

Падрыхтавала Тамара ЦЫРКУНОВА.




# Родная мова – крыніца празрыстая

21 лютага 2023 г. у сельскай бібліятэцы аграгарадка Усход прайшла гадзіна роднай мовы «Мова наша прыгожая», якую аздобіла афармленая кніжная выстава «Родная мова – крыніца празрыстая». Бібліятэкар расказала гісторыю ўзнікнення і развіцця беларускай мовы і прапанавала прысутным размаўляць па-беларуску. Дзеці чыталі на роднай мове, а напрыканцы ўзялі роднамоўныя кнігі дадому.

*Ганна ДАНІЛОВІЧ.*








**21** лютага 2023 г. выхаванцаў дзіцячага садка ДУА «Махаўская сярэдняя школа», запрасілі ў бібліятэку прыняць удзел у гульні «Па старонках роднай мовы». Дзеці завіталі ў госці да нашай роднай мовы, а адправіліся яны ў падарожжа на цягніку. Удзельнікі мерапрыемства правяралі свае веды беларускай мовы на прыпынках «Знаёмства», «Ветлівыя словы», «Забаўлянка», «Беларуская гульня», «Беларускія танцы». Дзеці дзяліліся сваімі ўражаннямі і паказалі прыклад ветлівых паводзін.

*Кацярына ДУБРОЎСКАЯ.*




**21** лютага 2023 г. у Сідаравіцкай сельскай бібліятэцы прайшла гадзіна роднай мовы «Зямлі маёй роднае слова». Удзельнікі імпрэзы даведаліся пра гісторыю ўзнікнення Дня роднай мовы, пазнаёміліся з афармленай кніжнай выставай «Я люблю беларускую мову», пачыталі свае любімыя творы беларускіх пісьменнікаў і прынялі ўдзел у віктарыне «Чароўная мова».

*Таццяна САЛАНОВІЧ.*











**Ч**ытачам Семукацкай сельскай бібліятэкі 21 лютага 2023 г. была прапанавана кніжная выстава “Гучны голас роднай мовы”, дзе прадстаўлены творы народных класікаў беларускай літаратуры, а таксама творы сучасных аўтараў. Для вучняў ДУА “Семукацкі УПК ДС-СШ” была праведзена інтэлектуальная гульня “Таямніцы беларускіх слоў”. Вучні здзейснілі падарожжа ў гісторыю Міжнароднага дня роднай мовы, чыталі мастацкія творы пра нашу родную зямлю, яе працавітых людзей, адгадвалі загадкі, расказвалі прыказкі і прымаўкі, удзельнічалі ў віктарынах. У этнаграфічным пакоі, які мае выгляд сялянскай хаты, дзеці даведаліся, як паступова мянялася жыццё нашых продкаў, іх быт, прылады працы, якімі карысталіся раней.

*Ала СТРЫКУНОВА.*



*“БІБЛІЯТЭЧНЫ ГАСЦІНЕЦ”*
Інфармацыйны бюлетэнь
дзяржаўнай установы культуры
“Магілёўская раённая сетка публічных бібліятэк”.
Распаўсюджваецца на правах
унутранай дакументацыі.

Адказны за выпуск —
Юлія Мікалаеўна Яцкова
Адрас: 213134 Магілёўскі раён,
аг.Буйнічы, вул.Легендарная, д.10 кв.57-58
тэл. 8 (0222) 71-20-77, 70-85-21
e-mail: rcbs.buin@yandex.by, brulib@yandex.by

Матэрыялы друкуюцца на мове аўтараў.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць
за падбор і дакладнасць фактаў.
Звярстана і надрукавана на ўласным абсталяванні.
Падрыхтавана да друку *27.02.2023. 21.00.*
Наклад 30 асобнікаў. Распаўсюджваецца бясплатна.

ВКонтакте
https://vk.com/public156515205